Зарегистрировано в Национальном реестре правовых актов

Республики Беларусь 5 декабря 2008 г. N 8/20022

**ПАСТАНОВА МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**
**25 лістапада 2008 г. N 40**

# АБ ЗАЦВЯРДЖЭННІ ІНСТРУКЦЫІ АБ ПАРАДКУ ЎЛІКУ І ІНВЕНТАРЫЗАЦЫІ КАШТОЎНАСЦЕЙ КУЛЬТУРНА-ГІСТАРЫЧНАГА ФОНДУ, ЯКІЯ ЗНАХОДЗЯЦЦА Ў ПАДНАЧАЛЕНЫХ МІНІСТЭРСТВУ КУЛЬТУРЫ АРГАНІЗАЦЫЯХ, А ТАКСАМА Ў СТРУКТУРНЫХ ПАДРАЗДЗЯЛЕННЯХ МЯСЦОВЫХ ВЫКАНАЎЧЫХ І РАСПАРАДЧЫХ ОРГАНАЎ, ЯКІЯ АЖЫЦЦЯЎЛЯЮЦЬ ДЗЯРЖАЎНА-ЎЛАСНЫЯ ПАЎНАМОЦТВЫ Ў ГАЛІНЕ КУЛЬТУРЫ, І ПАДНАЧАЛЕНЫХ ІМ АРГАНІЗАЦЫЯХ

На падставе абзаца чацвёртага пункта 11 і абзаца чацвёртага часткі першай пункта 12 Палажэння аб Дзяржаўным фондзе каштоўных металаў і каштоўных камянёў Рэспублікі Беларусь, зацверджанага Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 19 красавіка 2006 г. N 260, Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ПАСТАНАЎЛЯЕ:

Зацвердзіць Інструкцыю аб парадку ўліку і інвентарызацыі каштоўнасцей культурна-гістарычнага фонду, якія знаходзяцца ў падначаленых Міністэрству культуры арганізацыях, а таксама ў структурных падраздзяленнях мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, якія ажыццяўляюць дзяржаўна-ўласныя паўнамоцтвы ў галіне культуры, і падначаленых ім арганізацыях (дадаецца).

Міністр У.Ф.Матвейчук

УЗГОДНЕНА
Міністр фінансаў
Рэспублікі Беларусь
А.М.Харкавец
20.11.2008

УЗГОДНЕНА
Першы намеснік старшыні
Брэсцкага абласнога
выканаўчага камітэта
М.І.Юхімук
14.11.2008

УЗГОДНЕНА
Першы намеснік
старшыні
Віцебскага абласнога
выканаўчага камітэта
У.Г.Навацкі
14.11.2008

УЗГОДНЕНА
Старшыня
Гомельскага абласнога
выканаўчага камітэта
А.С.Якабсон
14.11.2008

УЗГОДНЕНА
Старшыня
Гродзенскага абласнога
выканаўчага камітэта
У.Я.Саўчанка
13.11.2008

УЗГОДНЕНА
Выконваючы абавязкі старшыні
Мінскага абласнога
выканаўчага камітэта
В.У.Шчэцька
13.11.2008

УЗГОДНЕНА
Першы намеснік
старшыні
Магілёўскага абласнога
выканаўчага камітэта
У.В.Краўцоў
13.11.2008

УЗГОДНЕНА
Старшыня
Мінскага гарадскога
выканаўчага камітэта
М.Я.Паўлаў
14.11.2008

ЗАЦВЕРДЖАНА
Пастанова
Міністэрства культуры
Рэспублікі Беларусь
25.11.2008 N 40

# ІНСТРУКЦЫЯ АБ ПАРАДКУ ЎЛІКУ І ІНВЕНТАРЫЗАЦЫІ КАШТОЎНАСЦЕЙ КУЛЬТУРНА-ГІСТАРЫЧНАГА ФОНДУ, ЯКІЯ ЗНАХОДЗЯЦЦА Ў ПАДНАЧАЛЕНЫХ МІНІСТЭРСТВУ КУЛЬТУРЫ АРГАНІЗАЦЫЯХ, А ТАКСАМА Ў СТРУКТУРНЫХ ПАДРАЗДЗЯЛЕННЯХ МЯСЦОВЫХ ВЫКАНАЎЧЫХ І РАСПАРАДЧЫХ ОРГАНАЎ, ЯКІЯ АЖЫЦЦЯЎЛЯЮЦЬ ДЗЯРЖАЎНА-ЎЛАСНЫЯ ПАЎНАМОЦТВЫ Ў ГАЛІНЕ КУЛЬТУРЫ, І ПАДНАЧАЛЕНЫХ ІМ АРГАНІЗАЦЫЯХ

## ГЛАВА 1
## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Інструкцыя аб парадку ўліку і інвентарызацыі каштоўнасцей культурна-гістарычнага фонду, якія знаходзяцца ў падначаленых Міністэрству культуры арганізацыях, а таксама ў структурных падраздзяленнях мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, якія ажыццяўляюць дзяржаўна-ўласныя паўнамоцтвы ў галіне культуры, і падначаленых ім арганізацыях (далей - Інструкцыя) распрацавана ў адпаведнасці з Палажэннем аб Дзяржаўным фондзе каштоўных металаў і каштоўных камянёў Рэспублікі Беларусь, зацверджаным Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 19 красавіка 2006 г. N 260 (Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь, 2006 г., N 69, 1/7502), Законам Рэспублікі Беларусь ад 21 чэрвеня 2002 года "О драгоценных металлах и драгоценных камнях" (Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь, 2002 г., N 73, 2/859), Законам Рэспублікі Беларусь ад 12 снежня 2005 года "Аб музеях і Музейным фондзе Рэспублікі Беларусь" (Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь, 2005 г., N 197, 2/1167), Палажэннем аб Музейным фондзе Рэспублікі Беларусь, зацверджаным пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 10 чэрвеня 2006 г. N 730 (Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь, 2006 г., N 93, 5/22433), Інструкцыяй аб парадку камплектавання музейных фондаў, унутрымузейнага ўліку, навуковай апрацоўкі і захоўвання музейных прадметаў і музейных калекцый, уключаных у Музейны фонд Рэспублікі Беларусь, навукова-дапаможных і сыравінных матэрыялаў, зацверджанай пастановай Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ад 1 лістапада 2007 г. N 44 (Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь, 2008 г., N 54, 8/18050), і вызначае парадак уліку і інвентарызацыі каштоўнасцей культурна-гістарычнага фонду Дзяржаўнага фонду каштоўных металаў і каштоўных камянёў Рэспублікі Беларусь (далей - музейныя прадметы з каштоўных металаў і каштоўных камянёў), якія знаходзяцца ў падначаленых Міністэрству культуры арганізацыях, а таксама ў структурных падраздзяленнях мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, якія ажыццяўляюць дзяржаўна-ўласныя паўнамоцтвы ў галіне культуры, і падначаленых ім арганізацыях (далей - установы).

Інструкцыя распаўсюджваецца на музеі, якія з'яўляюцца як юрыдычнымі асобамі, так і структурнымі падраздзяленнямі юрыдычных асоб (далей - музеі).

2. Музейныя прадметы з каштоўных металаў і каштоўных камянёў з'яўляюцца нацыянальным здабыткам і адносяцца да катэгорыі асабліва каштоўных музейных прадметаў. Яны з'яўляюцца састаўной часткай асноўнага фонду і не могуць быць аднесены да фонду навукова-дапаможных матэрыялаў.

3. Музейныя прадметы з каштоўных металаў і каштоўных камянёў з'яўляюцца каштоўнасцямі культурна-гістарычнага фонду Дзяржаўнага фонду каштоўных металаў і каштоўных камянёў Рэспублікі Беларусь.

4. Да музейных прадметаў з каштоўных металаў адносяцца:

музейныя прадметы, якія цалкам складаюцца з каштоўных металаў - плаціны і металаў плацінавай групы (паладый, ірыдый, родый, рутэній, осмій), золата, срэбра;

музейныя прадметы, у якія названыя ў абзацы другім гэтага пункта каштоўныя металы ўваходзяць як састаўныя часткі.

5. Да музейных прадметаў з каштоўных камянёў адносяцца:

музейныя прадметы з прыродных алмазаў, ізумрудаў, рубінаў, сапфіраў, александрытаў, прыроднага жэмчугу (за выключэннем прэснаводнага) у сырым (натуральным) і апрацаваным выглядзе, унікальныя прыродныя бурштынавыя ўтварэнні;

музейныя прадметы, у якія названыя ў абзацы другім гэтага пункта каштоўныя камяні ўваходзяць як састаўныя часткі.

6. Музейныя прадметы, у якіх каштоўныя металы знаходзяцца ў выглядзе інкрустацый, насечак і пакрыццяў, а таксама музейныя прадметы з тканіны з выкарыстаннем каштоўных металаў у выглядзе нітак, дроту, блішчынак і іншых дробных упрыгожанняў улічваюцца ў парадку, прадугледжаным для музейных прадметаў, якія не ўтрымліваюць каштоўныя металы і каштоўныя камяні і не падлягаюць уліку ў спецыяльных інвентарных кнігах.

7. Установы, якія захоўваюць музейныя прадметы з каштоўных металаў і каштоўных камянёў, абавязаны атрымаць спецыяльны дазвол (ліцэнзію) на дзейнасць, звязаную з каштоўнымі металамі і каштоўнымі камянямі, у Міністэрстве фінансаў Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

8. Музеі, якія захоўваюць музейныя прадметы з каштоўных металаў і каштоўных камянёў, абавязаны забяспечыць іх належны ўлік і ўмовы для іх поўнай захаванасці ў месцах захоўвання і экспанавання, у працэсе рэстаўрацыі і транспарціроўкі.

9. Кіраўнік музея нясе адказнасць за стварэнне ўмоў і выкананне правілаў, якія забяспечваюць улік, навуковую апрацоўку, інвентарызацыю (зверку наяўнасці), рэстаўрацыю і кансервацыю музейных прадметаў з каштоўных металаў і каштоўных камянёў, іх захаванасць у фондасховішчах, пастаянных экспазіцыях і выстаўках, прыём і перадачу такіх прадметаў у пастаяннае і часовае захоўванне, рэстаўрацыю, ахову, апламбіраванне і апячатванне памяшканняў, у якіх знаходзяцца музейныя прадметы з каштоўных металаў і каштоўных камянёў, вызначэнне правоў і абавязкаў адказных захавальнікаў, на якіх ускладзена захоўванне музейных прадметаў з каштоўных металаў і каштоўных камянёў.

Інвентарызацыя (зверка наяўнасці) музейных прадметаў з каштоўных металаў і каштоўных камянёў з уліковай дакументацыяй - сістэматычная, у парадку, прадугледжаным дадзенай Інструкцыяй, праверка фактычнай наяўнасці і стану захаванасці музейных прадметаў з каштоўных металаў і каштоўных камянёў, якія захоўваюцца ў фондах музея.

Інвентарызацыя музейных прадметаў уключае зверку наяўнасці музейных прадметаў з каштоўных металаў і каштоўных камянёў з кнігамі паступленняў музейных прадметаў асноўнага фонду, інвентарнымі кнігамі, спецыяльнымі інвентарнымі кнігамі ўліку, актамі прыёму і перадачы музейных прадметаў на пастаяннае і часовае захоўванне, актамі прыёму на матэрыяльна адказнае захоўванне, актамі экспертызы музейных прадметаў з каштоўных металаў і каштоўных камянёў. Інвентарызацыя (зверка наяўнасці) праводзіцца камісіяй, прызначанай загадам кіраўніка музея. Вынікі інвентарызацыі (зверкі-наяўнасці) музейных прадметаў з каштоўных металаў і каштоўных камянёў фіксуюцца ў актах, якія зацвярджаюцца кіраўніком музея.

10. Адказнымі захавальнікамі музейных прадметаў з каштоўных металаў і каштоўных камянёў прызначаюцца навуковыя супрацоўнікі, якія маюць вышэйшую адукацыю, стаж работы на дадзенай пасадзе не менш за два гады, спецыяльную падрыхтоўку ў сферы ўліковa-захавальніцкай работы з музейнымі прадметамі з каштоўных металаў і каштоўных камянёў, а таксама атэставаныя на веданне нормаў і патрабаванняў дадзенай Інструкцыі. Парадак правядзення атэстацыі вызначаецца кіраўніком установы па ўзгадненні з галоўным захавальнікам.

11. З асобамі, якія заняты ў захоўванні, выкарыстанні, транспарціроўцы музейных прадметаў з каштоўных металаў і каштоўных камянёў, павінны быць заключаны дагаворы аб прыняцці на сябе работнікам поўнай матэрыяльнай адказнасці за незабеспячэнне захаванасці перададзеных ім музейных прадметаў з каштоўных металаў і каштоўных камянёў.

12. Разам з кіраўніком музея адказнасць за ўлік і захоўванне музейных прадметаў з каштоўных металаў і каштоўных камянёў, іх кансервацыю і рэстаўрацыю нясе галоўны захавальнік або асоба, на якую загадам кіраўніка ўстановы ўскладзены абавязкі адказнага захавальніка музейных прадметаў з каштоўных металаў і каштоўных камянёў.

## ГЛАВА 2
## УЛІК МУЗЕЙНЫХ ПРАДМЕТАЎ З КАШТОЎНЫХ МЕТАЛАЎ І КАШТОЎНЫХ КАМЯНЁЎ

13. Улік музейных прадметаў з каштоўных металаў і каштоўных камянёў павінен забяспечваць:

ахову музейных прадметаў і стварэнне ўмоў для іх вывучэння і выкарыстання;

фіксацыю іх фактычнай наяўнасці на адпаведны перыяд;

захаванасць у месцах іх захоўвання і экспанавання;

своечасовасць і дакладнасць прадстаўлення справаздач аб іх колькасці і месцазнаходжанні, аб руху каштоўных металаў і каштоўных камянёў па структурных падраздзяленнях і арганізацыі цалкам;

дакладнасць даных у формах дзяржаўнай статыстычнай справаздачнасці.

14. Адказнасць за арганізацыю ўліку музейных прадметаў з каштоўных металаў і каштоўных камянёў ускладаецца на кіраўніка музея і галоўнага захавальніка, а за выкананне патрабаванняў уліку - на асобу, якая загадам кіраўніка прызначана матэрыяльна адказнай за музейныя прадметы з каштоўных металаў і каштоўных камянёў.

15. Музеі, якія захоўваюць музейныя прадметы з каштоўных металаў і каштоўных камянёў, абавязаны забяспечыць тры стадыі іх уліку:

першасную рэгістрацыю (рэгістрацыю ў кнізе паступленняў музейных прадметаў асноўнага фонду);

навуковую інвентарызацыю (рэгістрацыю ў інвентарных кнігах);

рэгістрацыю ў спецыяльных інвентарных кнігах уліку.

16. Першасная рэгістрацыя (рэгістрацыя ў кнізе паступленняў музейных прадметаў асноўнага фонду) і навуковая інвентарызацыя (рэгістрацыя ў інвентарных кнігах) музейных прадметаў з каштоўных металаў і каштоўных камянёў праводзяцца ў адпаведнасці з главамі 7, 8, 10 Інструкцыі аб парадку камплектавання музейных фондаў, унутрымузейнага ўліку, навуковай апрацоўкі і захоўвання музейных прадметаў і музейных калекцый, уключаных у Музейны фонд Рэспублікі Беларусь, навукова-дапаможных і сыравінных матэрыялаў.

17. Музейныя прадметы з каштоўных металаў і каштоўных камянёў, якія знаходзяцца на захоўванні ў музеях, падлягаюць экспертызе каштоўных металаў і каштоўных камянёў у Дзяржаўнай інспекцыі прабірнага нагляду Міністэрства фінансаў Рэспублікі Беларусь (далей - Дзяржпрабнагляд), за выключэннем прадметаў, транспарціроўка якіх з'яўляецца непажаданай альбо немагчымай па прычынах, якія могуць прывесці да парушэння музейнага прадмета ці яго масы. Экспертыза такіх прадметаў ажыццяўляецца спецыялістам Дзяржпрабнагляду непасрэдна ў памяшканні музея ў прысутнасці асобы, якая загадам кіраўніка прызначана матэрыяльна адказнай за музейныя прадметы з каштоўных металаў і каштоўных камянёў.

18. Абавязковай экспертызе падлягаюць ордэны Айчыннай вайны I і II ступені, якія выпушчаны да 40-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.

19. Вынікі экспертызы музейных прадметаў з каштоўных металаў і каштоўных камянёў афармляюцца адпаведным актам экспертызы музейных прадметаў з каштоўных металаў і каштоўных камянёў згодна з дадаткам 1, які з'яўляецца падставай для запаўнення графы 6 кнігі паступленняў музейных прадметаў асноўнага фонду, графы 7 інвентарных кніг.

20. Акты экспертызы музейных прадметаў з каштоўных металаў і каштоўных камянёў рэгіструюцца ў журнале ўліку актаў экспертызы музейных прадметаў з каштоўных металаў і каштоўных камянёў згодна з дадаткам 2 да дадзенай Інструкцыі з прысваеннем ім парадкавага нумара. Акты экспертызы музейных прадметаў з каштоўных металаў і каштоўных камянёў і журналы іх уліку маюць пастаянны тэрмін захоўвання.

21. Да экспертызы прадметы музейнага значэння, якія, як мяркуецца, утрымліваюць каштоўныя металы і каштоўныя камяні, афармляюцца па актах прыёму прадметаў музейнага значэння на часовае

захоўванне з пазначэннем колеру металу і каменя. Пры акціраванні азначаных прадметаў, якія маюць кляймо пробы, а таксама нумар вытворцы, у акце пазначаюцца гэтыя даныя.

22. Для прадметаў фалерыстыкі, якія ўтрымліваюць каштоўныя металы, у актах прыёму музейных прадметаў на часовае і пастаяннае захоўванне неабходна ўказваць нумары ўзнагарод, калі такія ёсць.

23. Акт экспертызы музейных прадметаў з каштоўных металаў і каштоўных камянёў, запоўнены ў межах кампетэнцыі музея, падпісваецца кіраўніком, матэрыяльна адказнай асобай, якая загадам кіраўніка прызначана матэрыяльна адказнай за музейныя прадметы з каштоўных металаў і каштоўных камянёў, завяраецца пячаткай установы да прадстаўлення каштоўнасцей у Дзяржпрабнагляд.

Вынікі праведзеных работ па экспертызе адлюстроўваюцца ў адпаведных графах актам экспертызы каштоўных металаў і каштоўных камянёў, зацвярджаюцца подпісамі спецыялістаў, якія праводзілі дадзеныя работы, начальніка Дзяржпрабнагляду і завяраюцца пячаткай Дзяржпрабнагляду.

24. У працэсе ўліку музейных прадметаў, у якія каштоўныя металы і каштоўныя камяні ўваходзяць як састаўныя часткі, пазначаецца вага каштоўных металаў і маса каштоўных камянёў асобна на падставе вылічэння, якое здзяйсняецца спецыялістамі Дзяржпрабнагляду.

25. Улік каштоўных металаў і каштоўных камянёў у музейных прадметах вядзецца з дакладнасцю:

золата і металаў плацінавай групы - да 0,01 г;

срэбра - да 0,1 г;

каштоўных камянёў - да 0,01 карата.

26. Для нумізматычных матэрыялаў масавага вырабу, якія маюць рэгламентаваныя пробу і масу згодна з каталогамі, у акце прыёму музейных прадметаў з каштоўных металаў і каштоўных камянёў на матэрыяльна адказнае захоўванне пазначаецца спасылка на адпаведныя раздзел, старонку выкарыстоўваемага каталога, яго выхадныя даныя.

27. Уліковыя дакументы павінны запаўняцца дакладна без неабгрунтаваных выпраўленняў.

28. Выпраўленне запісаў ва ўліковых дакументах магчыма толькі ў выключных выпадках пры дапушчэнні недакладнасцей ці памылак. Пры неабходнасці ўнясення выпраўленняў у спецыяльныя інвентарныя кнігі ўліку прымаецца адпаведнае рашэнне фондава-закупачнай камісіі музея (далей - ФЗК), вядзецца электронны журнал фіксацыі выпраўленняў у спецыяльных інвентарных кнігах уліку згодна з дадаткам 3, у якім фіксуюцца даныя аб выпраўленнях. Журнал раздрукоўваецца ў канцы справаздачнага года, запісы аб выпраўленнях завяраюцца подпісам кіраўніка музея, галоўнага захавальніка і пячаткай установы.

29. Ва ўліковых дакументах музейных прадметаў з музейных прадметаў і каштоўных камянёў, афармленых на папяровых носьбітах, выпраўленні ў запісах, зробленыя па рашэнні ФЗК, выконваюцца чырвонымі чарніламі. Пры гэтым старыя запісы закрэсліваюцца адной рысай, новыя запісы павінны добра чытацца. Выпраўленне завяраецца подпісам кіраўніка музея, галоўнага захавальніка, пячаткай музея.

30. Уліковыя дакументы музейных прадметаў з каштоўных металаў і каштоўных камянёў падлягаюць захоўванню ў галоўнага захавальніка ці асобы, якая загадам кіраўніка прызначана матэрыяльна адказнай за музейныя прадметы з каштоўных металаў і каштоўных камянёў, у спецыяльна абсталяваным памяшканні або незгаральнай шафе як дакументы строгай справаздачнасці.

31. Вынас уліковых дакументаў на музейныя прадметы з каштоўных металаў і каштоўных камянёў за межы музея забаронены.

## ГЛАВА 3
## РЭГІСТРАЦЫЯ МУЗЕЙНЫХ ПРАДМЕТАЎ З КАШТОЎНЫХ МЕТАЛАЎ І КАШТОЎНЫХ КАМЯНЁЎ У СПЕЦЫЯЛЬНЫХ ІНВЕНТАРНЫХ КНІГАХ УЛІКУ

32. Музейныя прадметы з каштоўных металаў і каштоўных камянёў падлягаюць рэгістрацыі ў спецыяльных інвентарных кнігах уліку згодна з дадаткамі 4 - 8 да дадзенай Інструкцыі.

Рэгістрацыя музейных прадметаў з каштоўных металаў і каштоўных камянёў у спецыяльных інвентарных кнігах уліку ажыццяўляецца на падставе актаў прыёму музейных прадметаў на пастаяннае захоўванне, кніг паступленняў музейных прадметаў асноўнага фонду, інвентарных кніг, актаў экспертызы музейных прадметаў з каштоўных металаў і каштоўных камянёў.

Пры рэгістрацыі музейных прадметаў з каштоўных металаў і каштоўных камянёў абавязкова праводзіцца іх фотафіксацыя.

33. Пры фарміраванні ўліковай дакументацыі музейных прадметаў з каштоўных металаў і каштоўных камянёў на электронных носьбітах з дапамогай аўтаматызаванай сістэмы ўліку музейных прадметаў і музейных калекцый уліковымі дакументамі з'яўляюцца друкаваныя дакументы, кожная старонка якіх пранумаравана, прашнуравана. Штоквартальна ўліковыя дакументы падлягаюць праверцы галоўным захавальнікам, падпісваюцца кіраўніком музея, галоўным захавальнікам, завяраюцца пячаткай музея.

34. Спецыяльныя інвентарныя кнігі ўліку фарміруюцца ў выглядзе асобных кніг:

для рэчавых крыніц, якія цалкам складаюцца з каштоўных металаў і каштоўных камянёў, а таксама тых, у якія каштоўныя металы і каштоўныя камяні ўваходзяць як састаўныя часткі, згодна з дадаткам 4;

для музейных прадметаў фалерыстыкі, якія цалкам складаюцца з каштоўных металаў і каштоўных камянёў, а таксама тых, у якіх каштоўныя металы і каштоўныя камяні ўваходзяць як састаўныя часткі, згодна з дадаткам 5;

для музейных прадметаў нумізматыкі згодна з дадаткам 6;

для скарбаў згодна з дадаткам 7;

для музейных прадметаў, якія цалкам складаюцца з золата, згодна з дадаткам 8.

35. Абязлічаныя рэшткі і фрагменты каштоўных металаў павінны знаходзіцца на часовым захоўванні ў музейных фондах і падлягаюць акціраванню і ўліку па колькасці і масе кожнай дэталі або каштоўнага каменя ў кнізе ўліку прадметаў фонду часовага захоўвання. Пасля вызначэння іх прыналежнасці яны атрымліваюць ідэнтыфікацыйны нумар музейнага прадмета, якому належаць, і пераводзяцца на пастаяннае захоўванне.

36. Ідэнтыфікацыйныя нумары, прысвоеныя музейным прадметам з каштоўных металаў і каштоўных камянёў у адпаведнасці з запісамі ва ўліковых дакументах, у тым ліку спецыяльных інвентарных кнігах уліку, пазначаюцца на кожным музейным прадмеце. Яны праставуляюцца тушшу чорнага колеру на неэкспазіцыйнай частцы прадмета або на бірках, укладзеных у прадмет ці падвешаных да яго.

37. Манетныя скарбы запісваюцца ў спецыяльную інвентарную кнігу ўліку скарбаў у поўным складзе (манеты з каштоўных металаў і простых металаў). Кожная адзінка манет з каштоўных металаў запісваецца асобна. Манеты з простых металаў запісваюцца ў графе "Заўвагі" агульнай колькасцю.

38. Кантроль за своечасовым вяртаннем музейных прадметаў з каштоўных металаў і каштоўных камянёў, якія былі прыняты або выдадзены на часовае захоўванне, вядзе загадчык аддзела (сектара) уліку або адказны навуковы супрацоўнік музея.

39. Перадача музейных прадметаў з каштоўных металаў і каштоўных камянёў у Дзяржпрабнагляд для экспертызы ажыццяўляецца па актах перадачы музейных прадметаў на часовае захоўванне і актах экспертызы музейных прадметаў з каштоўных металаў і каштоўных камянёў, запоўненых у межах кампетэнцыі музея.

40. Унутрымузейны рух музейных прадметаў з каштоўных металаў і каштоўных камянёў (з аднаго аддзела ў іншы, на экспазіцыю, на кансервацыю і рэстаўрацыю і іншае) ажыццяўляецца пры наяўнасці пісьмовага распараджэння кіраўніка музея і афармляецца актам унутрымузейнай перадачы музейных прадметаў з каштоўных металаў і каштоўных камянёў згодна з дадаткам 9, які рэгіструецца ў журнале рэгістрацыі актаў унутрымузейнай перадачы музейных прадметаў з каштоўных металаў і каштоўных камянёў згодна з дадаткам 10 да дадзенай Інструкцыі.

41. Перадача музейных прадметаў з каштоўных металаў і каштоўных камянёў ад адной матэрыяльна адказнай асобы да іншай ажыццяўляецца па пісьмоваму загаду кіраўніка музея камісіяй у колькасці не менш за 3 чалавекі. Па выніках перадачы складаецца акт прыёму музейных прадметаў з каштоўных металаў і

каштоўных камянёў на матэрыяльна адказнае захоўванне згодна з дадаткам 11, які рэгіструецца ў журнале рэгістрацыі актаў прыёму музейных прадметаў з каштоўных металаў і каштоўных камянёў на матэрыяльна адказнае захоўванне згодна з дадаткам 12 да дадзенай Інструкцыі.

42. Выключэнне музейных прадметаў, якія ўтрымліваюць каштоўныя металы і каштоўныя камяні, ажыццяўляецца ва ўстаноўленым у Рэспубліцы Беларусь парадку з кніг паступленняў музейных прадметаў асноўнага фонду, інвентарных кніг, спецыяльных інвентарных кніг уліку. Пры выключэнні адпаведная адзнака робіцца ў кнігах паступленняў музейных прадметаў асноўнага фонду, інвентарных кнігах, спецыяльных інвентарных кнігах уліку ў графе "Заўвагі", падпісваецца галоўным захавальнікам і завяраецца пячаткай установы.

## ГЛАВА 4
## ІНВЕНТАРЫЗАЦЫЯ (ЗВЕРКА НАЯЎНАСЦІ) МУЗЕЙНЫХ ПРАДМЕТАЎ З КАШТОЎНЫХ МЕТАЛАЎ І КАШТОЎНЫХ КАМЯНЁЎ З УЛІКОВАЙ ДАКУМЕНТАЦЫЯЙ

43. Музеі, якія захоўваюць музейныя прадметы з каштоўных металаў і каштоўных камянёў, абавязаны сістэматычна праводзіць інвентарызацыю (зверку наяўнасці) з уліковай дакументацыяй (кнігамі паступленняў музейных прадметаў асноўнага фонду, інвентарнымі кнігамі, спецыяльнымі інвентарнымі кнігамі ўліку, актамі прыёму і перадачы музейных прадметаў на пастаяннае і часовае захоўванне, актамі прыёму музейных прадметаў на матэрыяльна адказнае захоўванне, актамі экспертызы музейных прадметаў з каштоўных металаў і каштоўных камянёў), ажыццяўляць кантроль за станам захаванасці музейных прадметаў, якія ўтрымліваюць каштоўныя металы і каштоўныя камяні.

44. Інвентарызацыя (зверка наяўнасці) музейных прадметаў з каштоўных металаў і каштоўных камянёў з уліковай дакументацыяй ажыццяўляецца ў адпаведнасці з графікам, зацверджаным кіраўніком музея, па яго загадзе, у якім вызначаецца склад камісіі і тэрміны работы.

У склад камісіі ўваходзяць галоўны захавальнік, галоўны бухгалтар, навуковыя супрацоўнікі. Старшынёй камісіі прызначаецца намеснік дырэктара па навуковай рабоце, у выпадку адсутнасці такой пасады ў музеі - кіраўнік музея.

Матэрыяльна адказныя асобы, на адказным захоўванні ў якіх знаходзяцца музейныя прадметы з каштоўных металаў і каштоўных камянёў, у склад камісіі не ўваходзяць, але прысутнічаюць пры зверцы.

Камісія забяспечвае паўнату, правільнасць і дасканаласць занясення ў выніковыя дакументы даных аб музейных прадметах з каштоўных металаў і каштоўных камянёў.

45. Інвентарызацыя (зверка наяўнасці) музейных прадметаў з каштоўных металаў і каштоўных камянёў абавязкова праводзіцца:

пры змене кіраўніка ўстановы, музея, матэрыяльна адказных асоб на дзень прыёму, перадачы спраў;

пры змене ўласніка або рэарганізацыі ўстановы;

пры ліквідацыі ўстановы па рашэнні ўпаўнаважаных органаў.

46. Пры зверцы наяўнасці музейныя прадметы з каштоўных металаў і каштоўных камянёў падлягаюць абавязковаму ўзважванню.

47. Музеі, якія захоўваюць да 1000 адзінак музейных прадметаў з каштоўных металаў і каштоўных камянёў, праводзяць інвентарызацыю (зверку наяўнасці) штогод.

У музеях, якія захоўваюць 1000 і болей музейных прадметаў з каштоўных металаў і камянеў, інвентарызацыя (зверка наяўнасці) праводзіцца штогод выбарачна згодна з графікам, зацверджаным кіраўніком музея.

48. Фактычная наяўнасць каштоўных металаў пры правядзенні інвентарызацыі (зверкі наяўнасці) вызначаецца шляхам узважвання на вагах, якія забяспечваюць межы дапушчальных пагрэшнасцей у залежнасці ад масы музейнага прадмета.

49. Вынікі інвентарызацыі (зверкі наяўнасці) музейных прадметаў з каштоўных металаў і каштоўных камянёў з уліковай дакументацыяй фіксуюцца ў акце зверкі наяўнасці музейных прадметаў з каштоўных

металаў і каштоўных камянёў з уліковай дакументацыяй згодна з дадаткам 13 да дадзенай Інструкцыі, які падпісваецца галоўным захавальнікам музея, членамі камісіі і зацвярджаецца кіраўнікам музея.

Дадатак 1
да Інструкцыі
аб парадку ўліку і інвентарызацыі
каштоўнасцей культурна-гістарычнага фонду,
якія знаходзяцца ў падначаленых Міністэрству
культуры арганізацыях, а таксама ў структурных
падраздзяленнях мясцовых выканаўчых
і распарадчых органаў, якія ажыццяўляюць
дзяржаўна-ўласныя паўнамоцтвы ў галіне
культуры, і падначаленых ім арганізацыях

Вынікі экспертызы зацвярджаю
Начальнік Дзяржаўнай інспекцыі
прабірнага нагляду Міністэрства
фінансаў Рэспублікі Беларусь

__________ _____________________
(подпіс) (прозвішча, ініцыялы)
М.П.
"__" ________________ 20__ г.

**АКТ**
**экспертызы музейных прадметаў з каштоўных металаў і каштоўных камянёў**

_____________________________________________
(назва музея)

| N п/п | Нумар па кнізе паступленняў музейных прадметаў асноўнага фонду, нумар па інвентарнай кнізе, нумар па спецыяльнай інвентарнай кнізе | Назва музейнага прадмета, яго памер у мм, агульная маса ў грамах | Кароткае апісанне музейнага прадмета і размяшчэння камянёў | Назва каштоўнага метала | Проба | Маса каштоўнага металу ў грамах | | Назва ўстаўкі | Колькасць, шт. | Маса, караты, грамы | Памер устаўкі | Форма агранкі, колькасць граней верху, нізу | Заўвагі |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | ліга-тура | чыс-ціня | | | | | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 | 13 |
| | | | | | | | | | | | | | |

Усяго па акце ў чысціні металу: плаціна _________ г; золата ____________ г;

срэбра _____ г.
Кіраўнік музея ____________________________
Матэрыяльна адказная асоба ________________
М.П.
Экспертызу каштоўных металаў і каштоўных камянёў правёў ________________________

Дадатак 2
да Інструкцыі
аб парадку ўліку і інвентарызацыі
каштоўнасцей культурна-гістарычнага фонду,
якія знаходзяцца ў падначаленых Міністэрству
культуры арганізацыях, а таксама ў структурных
падраздзяленнях мясцовых выканаўчых
і распарадчых органаў, якія ажыццяўляюць
дзяржаўна-ўласныя паўнамоцтвы ў галіне
культуры, і падначаленых ім арганізацыях

______________________________________________
(назва музея)

**ЖУРНАЛ**
**уліку актаў экспертызы музейных прадметаў з каштоўных металаў і каштоўных камянёў**

| N п/п | Нумар акта | Дата акта | Маса ў грамах у чысціні металу | Маса ў каратах (для каштоўных камянёў) | Колькасць музейных прадметаў | Заўвагі |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 |
| | | | | | | |

Кіраўнік музея _______________________________
Матэрыяльна адказная асоба __________________
М.П.

Дадатак 3
да Інструкцыі аб парадку ўліку і інвентарызацыі
каштоўнасцей культурна-гістарычнага фонду,
якія знаходзяцца ў падначаленых Міністэрству
культуры арганізацыях, а таксама ў структурных
падраздзяленнях мясцовых выканаўчых
і распарадчых органаў, якія ажыццяўляюць
дзяржаўна-ўласныя паўнамоцтвы ў галіне
культуры, і падначаленых ім арганізацыях

______________________________________________
(назва музея)

**ЖУРНАЛ**
**фіксацыі выпраўленняў у спецыяльных інвентарных кнігах уліку**

| N п/п | Дата | Нумар і дата пратакола фондава-закупачнай камісіі | Ідэнтыфікацыйны нумар | Назва поля | Старое значэнне поля | Новае значэнне поля | Подпіс галоўнага захавальніка, пячатка |
|---|---|---|---|---|---|---|---|

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | музея |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
| | | | | | | | |

Кіраўнік музея ______________________________
Матэрыяльна адказная асоба ________________
М.П.

Дадатак 4
да Інструкцыі аб парадку ўліку і інвентарызацыі
каштоўнасцей культурна-гістарычнага фонду,
якія знаходзяцца ў падначаленых Міністэрству
культуры арганізацыях, а таксама ў структурных
падраздзяленнях мясцовых выканаўчых
і распарадчых органаў, якія ажыццяўляюць
дзяржаўна-ўласныя паўнамоцтвы ў галіне
культуры, і падначаленых ім арганізацыях

______________________________________________
(назва музея)

**СПЕЦЫЯЛЬНАЯ ІНВЕНТАРНАЯ КНІГА**
**ўліку рэчавых крыніц, якія цалкам складаюцца з каштоўных металаў ці каштоўных камянёў, а таксама тых, у якія каштоўныя металы і каштоўныя камяні ўваходзяць як састаўныя часткі**

| N п/п і дата запісу | Нумар па кнізе паступленняў музейных прадметаў асноўнага фонду; нумар па інвентарнай кнізе; нумар паспецыяльнай інвентарнай кнізе | Назва і кароткае апісанне прадмета | Матэрыял, метал | | | | Каштоўныя камяні | | | Памер (у мм) | Коль-касць (адзі-нак) | Захава-насць | Падстава (нумар і дата акта апрабавання музейных прадметаў з каштоўных металаў і экспертызы каштоўных камянёў) | Заў-вагі |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | наз-ва | про-ба | маса (у грамах) | | назва | коль-касць | маса (у кара-тах) | | | | | |
| | | | | | ліга-турная маса | маса ў чысці-ні металу | | | | | | | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 | 13 | 14 | 15 |
| | | | | | | | | | | | | | | |

Кіраўнік музея ____________________________
Матэрыяльна адказная асоба ______________
М.П.

Дадатак 5

да Інструкцыі аб парадку ўліку і інвентарызацыі
каштоўнасцей культурна-гістарычнага фонду,
якія знаходзяцца ў падначаленых Міністэрству
культуры арганізацыях, а таксама ў структурных
падраздзяленнях мясцовых выканаўчых
і распарадчых органаў, якія ажыццяўляюць
дзяржаўна-ўласныя паўнамоцтвы ў галіне
культуры, і падначаленых ім арганізацыях

______________________________________________
(назва музея)

**СПЕЦЫЯЛЬНАЯ ІНВЕНТАРНАЯ КНІГА**
**ўліку прадметаў фалерыстыкі, якія цалкам складаюцца з каштоўных металаў і каштоўных камянёў, а таксама тых, у якія каштоўныя металы і каштоўныя камяні ўваходзяць як састаўныя часткі**

| N п/п і дата запісу | Нумар па кнізе паступленняў музейных прадметаў асноўнага фонду; нумар па інвентарнай кнізе; нумар па спецыяльнай інвентарнай кнізе | Назва і кароткае апісанне прадмета | Коль-касць | Назва металу | Проба металу | Маса (у грамах), проба | | Каштоўныя камяні | | | Памер (у мм) | Захава-насць | Падстава (нумар і дата акта апрабавання музейных прадметаў з каштоўных металаў і экспертызы каштоўных камянёў) | Заў-вагі |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | ліга-турная маса | маса ў чысці-ні металу | назва | коль-касць | маса (у кара-тах) | | | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 | 13 | 14 | 15 |
| | | | | | | | | | | | | | | |

Кіраўнік музея ____________________________
Матэрыяльна адказная асоба _________________
М.П.

Дадатак 6
да Інструкцыі аб парадку ўліку і інвентарызацыі

каштоўнасцей культурна-гістарычнага фонду,
якія знаходзяцца ў падначаленых Міністэрству
культуры арганізацыях, а таксама ў структурных
падраздзяленнях мясцовых выканаўчых
і распарадчых органаў, якія ажыццяўляюць
дзяржаўна-ўласныя паўнамоцтвы ў галіне
культуры, і падначаленых ім арганізацыях

____________________________________________

(назва музея)

**СПЕЦЫЯЛЬНАЯ ІНВЕНТАРНАЯ КНІГА**
**ўліку музейных прадметаў нумізматыкі**

| N п/п | Нумар па кнізе паступленняў музейных прадметаў асноўнага фонду; нумар па інвентарнай кнізе; нумар па спецыяльнай інвентарнай кнізе | Назва і кароткае апісанне прадмета | Коль-касць | Назва металу | Проба металу | Маса (у грамах), проба | | Памер (у мм) | Захава-насць | Падстава (нумар і дата акта апрабавання музейных прадметаў з каштоўных металаў і экспертызы каштоўных камянёў) | Заўвагі |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | лігатурная маса | маса ў чысціні металу | | | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
| | | | | | | | | | | | |

Кіраўнік музея ___________________________
Матэрыяльна адказная асоба ________________
М.П.

Дадатак 7
да Інструкцыі аб парадку ўліку і інвентарызацыі
каштоўнасцей культурна-гістарычнага фонду,
якія знаходзяцца ў падначаленых Міністэрству
культуры арганізацыях, а таксама ў структурных

падраздзяленнях мясцовых выканаўчых
і распарадчых органаў, якія ажыццяўляюць
дзяржаўна-ўласныя паўнамоцтвы ў галіне
культуры, і падначаленых ім арганізацыях

______________________________________________
(назва музея)

**СПЕЦЫЯЛЬНАЯ ІНВЕНТАРНАЯ КНІГА**
**ўліку скарбаў**

| N п/п і дата запісу | Нумар па кнізе паступ-ленняў музейных прадметаў асноўнага фонду; нумар па інвентарнай кнізе; нумар па спецы-яльнай інвентарнай кнізе | Назва і кароткае апісанне прад-мета | Коль-касць | Назва металу | Проба металу | Маса (у грамах), проба | | Каштоўныя камяні | | | Памер (у мм) | Захава-насць | Падстава (нумар і дата акта апраба-вання музейных прадметаў з каштоўных металаў і экспертызы каштоўных камянёў) | Заў-вагі |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | ліга-турная маса | маса ў чысці-ні металу | назва | коль-касць | маса (у кара-тах) | | | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 | 13 | 14 | 15 |
| | | | | | | | | | | | | | | |

Кіраўнік музея ________________________________
Матэрыяльна адказная асоба __________________
М.П.

Дадатак 8
да Інструкцыі аб парадку ўліку і інвентарызацыі
каштоўнасцей культурна-гістарычнага фонду,
якія знаходзяцца ў падначаленых Міністэрству
культуры арганізацыях, а таксама ў структурных
падраздзяленнях мясцовых выканаўчых

і распарадчых органаў, якія ажыццяўляюць
дзяржаўна-ўласныя паўнамоцтвы ў галіне
культуры, і падначаленых ім арганізацыях

______________________________________________
(назва музея)

**СПЕЦЫЯЛЬНАЯ ІНВЕНТАРНАЯ КНІГА**
**ўліку музейных прадметаў, якія цалкам складаюцца з золата**

| N п/п і дата запісу | Нумар па кнізе паступленняў музейных прадметаў асноўнага фонду і інвентарнай кнізе; нумар па спецыяльнай інвентарнай кнізе | Назва і кароткае апісанне прадмета | Матэрыял, метал | | | | Каштоўныя камяні | | | Памер (у мм) | Колькасць (адзінак) | Захаванасць | Падстава (нумар і дата акта апрабавання музейных прадметаў з каштоўных металаў і экспертызы каштоўных камянёў) | Заўвагі |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | назва | проба | маса (у грамах) | | назва | колькасць | маса (у каратах) | | | | | |
| | | | | | лігатурная маса | маса ў чыстыні металу | | | | | | | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 | 13 | 14 | 15 |
| | | | | | | | | | | | | | | |

Кіраўнік музея ____________________________
Матэрыяльна адказная асоба _______________
М.П.

Дадатак 9
да Інструкцыі аб парадку ўліку і інвентарызацыі
каштоўнасцей культурна-гістарычнага фонду,
якія знаходзяцца ў падначаленых Міністэрству
культуры арганізацыях, а таксама ў структурных
падраздзяленнях мясцовых выканаўчых
і распарадчых органаў, якія ажыццяўляюць
дзяржаўна-ўласныя паўнамоцтвы ў галіне
культуры, і падначаленых ім арганізацыях

______________________________________________________
(назва музея)

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Кіраўнік музея ____________
"__" _____________ 20__ г.
М.П.

**АКТ N ____**
**унутрымузейнай перадачы музейных прадметаў з каштоўных металаў і каштоўных камянёў**
"__" _____________ 20__ г.

Дадзены акт склалі:
асоба, на якую загадам кіраўніка ўскладзены абавязкі адказнага захавальніка музейных прадметаў з каштоўных металаў і каштоўных камянёў ________________
(прозвішча, імя, імя па бацьку)
і супрацоўнік музея _______________________________________________________
(пасада, прозвішча, імя, імя па бацьку)
у тым, што першы перадаў, а другі прыняў на часовае захоўванне музейныя прадметы з каштоўных металаў і каштоўных камянёў.
Мэта перадачы __________________________________________________________
Падстава _______________________________________________________________
Тэрмін _________________________________________________________________
(да якой даты перадаецца прадмет)

| N п/п | Нумар па кнізе паступленняў асноўнага фонду; нумар па інвентарнай кнізе; нумар па спецыяльнай інвентарнай кнізе | Назва і кароткае апісанне прадмета | Матэрыял | Маса металу (у грамах) і проба | Каштоўныя камяні (маса ў каратах) | Памеры музейнага прадмета (у мм) | Захаванасць | Заўвагі |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| | | | | | | | | |

Усяго па акце перададзена _____________________________ музейных прадметаў.
(лічбамі і прапіссю)
Перадаў __________ _____________ Прыняў ____________ _______________
(подпіс) (прозвішча, (подпіс) (прозвішча,

ініцыялы)                    ініцыялы)

Прысутнічаў
загадчык аддзела ўліку (фондаў) ___________     ________________________
(подпіс)     (прозвішча, ініцыялы)

Дадатак 10
да Інструкцыі аб парадку ўліку і інвентарызацыі
каштоўнасцей культурна-гістарычнага фонду,
якія знаходзяцца ў падначаленых Міністэрству
культуры арганізацыях, а таксама ў структурных
падраздзяленнях мясцовых выканаўчых
і распарадчых органаў, якія ажыццяўляюць
дзяржаўна-ўласныя паўнамоцтвы ў галіне
культуры, і падначаленых ім арганізацыях

_______________________________________________
(назва музея)

**ЖУРНАЛ**
**рэгістрацыі актаў унутрымузейнай перадачы музейных прадметаў з каштоўных металаў і каштоўных камянёў**

| N п/п | Нумар акта | Дата акта | Мэта перадачы | Тэрмін перадачы | Колькасць прадметаў | Перадаў | Прыняў | Адзнака аб вяртанні |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| | | | | | | | | |

Галоўны захавальнік ______________     _________________________
(подпіс)     (прозвішча, ініцыялы)

Дадатак 11
да Інструкцыі аб парадку ўліку і інвентарызацыі
каштоўнасцей культурна-гістарычнага фонду,
якія знаходзяцца ў падначаленых Міністэрству
культуры арганізацыях, а таксама ў структурных
падраздзяленнях мясцовых выканаўчых
і распарадчых органаў, якія ажыццяўляюць
дзяржаўна-ўласныя паўнамоцтвы ў галіне
культуры, і падначаленых ім арганізацыях

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Кіраўнік музея ______________
"__" _____________ 20__ г.
М.П.

**АКТ**
**прыёму музейных прадметаў з каштоўных металаў**
**і каштоўных камянёў на матэрыяльна адказнае захоўванне**
"__" _____________ 20__ г.

Дадзены акт складзены галоўным захавальнікам _______________________
(прозвішча, імя, імя па бацьку)
у присутнасці прадстаўніка аддзела ўліку (прадстаўніка аддзела фондаў) і захавальніка калекцыі на падставе рашэння ФЗК пратакол N ________________ і
_____________________________________________________________________________
(падраздзяленне,
_____________________________________________________________________________
куды перадаецца прадмет)
і ___________________________________________________________________________
(прозвішча, імя, імя па бацьку, пасада, аддзел, куды перадаецца прадмет)
у тым, што першы здаў, а другі прыняў на матэрыяльна адказнае захоўванне наступныя музейныя прадметы з каштоўных металаў і каштоўных камянёў.
Падстава ____________________________________________________________________

| Нумар па кнізе паступленняў асноўнага фонду, нумар па інвентарнай кнізе | Нумар па спецыяльнай інвентарнай кнізе | Назва і кароткае апісанне прадмета | Матэрыял | Маса металу ў грамах (лігатура, чысціня); проба | | | Каштоўныя камяні | | | Памер (у мм) | Захаванасць | Заўвагі |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | золата | срэбра | плаціна | назва | колькасць | маса ў каратах | | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 | 13 |
| | | | | | | | | | | | | |

Усяго па акце перададзена _________________________________________________
Перадаў
галоўны захавальнік _________ ____________ Прыняў ________ ______________
(подпіс) (прозвішча, ініцыялы) (подпіс) (прозвішча, ініцыялы)

Дадатак 12
да Інструкцыі аб парадку ўліку і інвентарызацыі
каштоўнасцей культурна-гістарычнага фонду,
якія знаходзяцца ў падначаленых Міністэрству
культуры арганізацыях, а таксама ў структурных
падраздзяленнях мясцовых выканаўчых
і распарадчых органаў, якія ажыццяўляюць
дзяржаўна-ўласныя паўнамоцтвы ў галіне
культуры, і падначаленых ім арганізацыях

______________________________________________
(назва музея)

**ЖУРНАЛ**
**рэгістрацыі актаў прыёму музейных прадметаў з каштоўных металаў і каштоўных камянёў на матэрыяльна адказнае захоўванне**

| N п/п | Нумар акта | Дата акта | Нумар і дата пратакола фондава-закупачнай камісіі | Колькасць музейных прадметаў | Прыняў | Перадаў | Маса ў грамах: лігатура, чысціня (для каштоўных металаў) | Маса ў каратах (для каштоўных камянёў) | Заўвагі |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| | | | | | | | | | |

Галоўны захавальнік ______________ ___________________________
(подпіс) (прозвішча, ініцыялы)

Дадатак 13
да Інструкцыі аб парадку ўліку і інвентарызацыі
каштоўнасцей культурна-гістарычнага фонду,
якія знаходзяцца ў падначаленых Міністэрству
культуры арганізацыях, а таксама ў структурных
падраздзяленнях мясцовых выканаўчых
і распарадчых органаў, якія ажыццяўляюць
дзяржаўна-ўласныя паўнамоцтвы ў галіне
культуры, і падначаленых ім арганізацыях

______________________________________________________________
(назва музея)

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Кіраўнік музея ____________
"__" ___________ 20__ г.
М.П.

**АКТ N ________**
**зверкі наяўнасці музейных прадметаў з каштоўных металаў**
**і каштоўных камянёў з уліковай дакументацыяй**
"__" _________ 20__ г.

Дадзены акт складзены ў тым, што згодна з загадам кіраўніка музея ад "__" ______________ 20__ г. N ________ камісія ў складзе___________________
___________________________________________________________________________
правяла праверку наяўнасці музейных прадметаў з каштоўных металаў і каштоўных камянёў, якія знаходзяцца на матэрыяльна адказным захоўванні ў
___________________________________________________________________________
(прозвішча, імя, імя па бацьку адказнага захавальніка)
з уліковымі дакументамі: __________________________________________________
(пералік уліковай дакументацыі)
___________________________________________________________________________

У выніку зверкі выяўлена наступнае: па дадзеных уліку на матэрыяльна адказным захаванні ў ________________________________________________________
(прозвішча, імя, імя па бацьку адказнага захавальніка)
на _____________ знаходзіцца _______________________________________________
(дата) (лічбай і прапіссю)
музейных прадметаў з каштоўных металаў і каштоўных камянёў, у якіх утрымліваецца агульнай вагой золата, срэбра і іншага ______________________

Фактычна ў музеі ў ___________________________________________________
(прозвішча, імя, імя па бацьку адказнага захавальніка)
знаходзіцца _______________________________________________________________
музейных прадметаў з каштоўных металаў і каштоўных камянёў, у якіх утрымліваецца агульнай вагой золата, срэбра, іншага _______________________
(лічбай і прапіссю)
што _________________________________________ дадзеным уліку.
(адпавядае (або не адпавядае)

У выніку зверкі вызначана наступнае:

______ разыходжанне(яў) з запісам ва ўліковых дакументах;

______ музейных прадметаў не выяўлена;

______ музейных прадметаў спісана ва ўстаноўленым парадку, але не выключана з уліковай дакументацыі музея;

_______ музейных прадметаў запісана двойчы пад рознымі нумарамі ў кнізе паступленняў музейных прадметаў асноўнага фонду.

Спіс музейных прадметаў, двойчы запісаных у кнігу паступленняў асноўнага фонду, дадаецца;

______ музейных прадметаў запісана двойчы пад рознымі нумарамі ў інвентарныя кнігі.

Спіс музейных прадметаў, якія двойчы запісаны ў інвентарную кнігу, дадаецца;

______прадметаў падлягаюць выключэнню. Спіс музейных прадметаў, якія падлягаюць выключэнню з асноўнага фонду музея, дадаецца.

Такім чынам, па стане на _____________ фактычная наяўнасць музейных
(дата)
прадметаў
з каштоўных металаў і каштоўных камянёў, якія знаходзяцца на матэрыяльна адказным захоўванні ў захавальніка ________________________________________
(прозвішча, імя, імя па бацьку адказнага захавальніка)
складае ____________________________ музейных прадметаў. У іх утрымліваецца агульнай вагой золата, срэбра, іншага _____________________________________

Подпісы членаў камісіі: _______________________
_______________________